Министерство образования Республики Беларусь

*Учреждение образования*
«Белорусский государственный педагогический университет
имени Максима Танка»

# ОБРАЗОВАНИЕ И НАУКА В БЕЛАРУСИ: АКТУАЛЬНЫЕ ПРОБЛЕМЫ И ПЕРСПЕКТИВЫ РАЗВИТИЯ В XXI в.

*Сборник научных статей*

Минск 2015

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

УДК 37+001(476)
ББК 74+72(4Беи)
О232

Печатается по решению редакционно-издательского совета БГПУ

Редколлегия:
доктор педагогических наук, профессор *А. В. Торхова* (отв. ред.);
кандидат исторических наук, доцент *П. А. Матюш*;
кандидат биологических наук, доцент *Е. В. Жудрик*;
кандидат биологических наук, доцент *А. А. Деревинская*

Рецензенты:
доктор технических наук, профессор *И. М. Елисеева*;
доктор исторических наук, профессор *Г. А. Космач*;
кандидат филологических наук, доцент *Д. В. Дятко*;
кандидат философских наук, доцент *И. Ю. Никитина*;
кандидат педагогических наук, доцент *Е. Н. Сороко*

О232 **Образование** и наука в Беларуси: актуальные проблемы и перспективы развития в XXI в. : сб. науч. ст. / Белорус. гос. пед. ун-т им. М. Танка ; редкол. : отв. ред. А. В. Торхова [и др.]. – Минск : БГПУ, 2015. – 230 с.
ISBN 978-985-541-215-2.

В сборнике представлены материалы докладов VIII научно-практической конференции молодых ученых БГПУ «Образование и наука в Беларуси: актуальные проблемы и перспективы развития в XXI веке», состоявшейся 23 октября 2015 г. Анализируются основные проблемы, пути решения и перспективные направления развития науки и образования по различным отраслям знания: филологии, истории, обществознанию, психологии, специальному образованию, педагогике и естествознанию.

Адресуется студентам, магистрантам, аспирантам, преподавателям и всем, кто интересуется тенденциями развития современной науки и образования.

**УДК 37+001(476)**
**ББК 74+72(4Беи)**

© БГПУ, 2015

**ISBN 978-985-541-215-2**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ФАРМІРАВАННЕ АСНОЎНЫХ КАМПЕТЭНЦЫЙ У СТУДЭНТАЎ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ ДЫСЦЫПЛІНЫ «ГІСТОРЫЯ ГРАМАДСКАЙ ДУМКІ БЕЛАРУСІ»

*П. А. Мацюш, БДПУ (г. Мінск)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Гістарычная адукацыя з'яўляецца найбольш істотным элементам гуманітарнай падрыхтоўкі і выхавання маладога пакалення, фарміравання нацыянальных, агульнадзяржаўных ідэалагічных арыенціраў, грамадзянскай самасвядомасці народа. Адукаванага і выхаванага чалавека немагчыма ўявіць без ведання гісторыі.

У час, калі адбываецца працэс грамадскага пераўладкавання, пераасэнсавання каштоўнасцей, найбольш востра стаіць праблема пошуку маральных арыенціраў. У гэтым выпадку яшчэ большую актуальнасць набывае выхаваўчы і светапоглядны патэнцыял гісторыі як крыніцы навуковых ведаў.

Патрабаванні сучаснага грамадства арыентуюць гісторыю на сістэматычнае і ўсебаковае даследаванне з'яў мінулага з улікам ролі, якую яны адыгрывалі ў гістарычным працэсе. Вывучэннем паступова ахопліваюцца ўсе сферы чалавечай дзейнасці: эканоміка, палітыка, культура, рэлігія, грамадская думка [2, с.1].

Грамадская думка Беларусі фарміравалася на працягу стагоддзяў. У аснове любога палітычнага, эканамічнага, сацыяльнага факта ляжыць тая ці іншая ідэя, якая паступова дабівалася агульнага прызнання, станавілася карыснай для грамадства, выступала ў якасці маральнага імператыву. Яна рэгулявала паводзіны асоб, розных груп, суполак, сацыяльных інстытутаў у грамадстве, выпрацоўвала пэўныя нормы грамадскага жыцця.

Выкладанне курса «Гісторыя грамадскай думкі Беларусі» непасрэдна звязана з вывучэннем інтэграванага модуля «Гісторыя», што істотна дапаўняе і паглыбляе яго змест.

У гэтай сітуацыі адной з канцэптуальна важных задач выкладання дысцыпліны «Гісторыя грамадскай думкі Беларусі» ў вышэйшай школе становіцца павышэнне цікавасці студэнтаў да вучобы. Неабходна выпрацоўваць у іх навуковы стыль мыслення, разуменне значнасці гістарычнай адукацыі, фарміраваць шырокі спектр гуманітарных кампетэнцый, якія ў далейшым дазволяць студэнту рэалізавацца ў прафесійнай дзейнасці. Фарміраванне персанальнай кампетэнтнасці будучага настаўніка забяспечваюць наступныя педагагічныя ўмовы: далучэнне студэнтаў да навукова-даследчай дзейнасці; накіраванасць вучэбна-выхаваўчага працэсу на рэакцыі суб'ектава-дзейнаснага зместу адукацыі; ажыццяўленне прафесійна-педагагічнага супрацоўніцтва паміж усімі суб'ектамі адукацыйнага працэсу; улік узроставых асаблівасцяў студэнтаў.

У сучасны перыяд не назапашванне ведаў і навыкаў з'яўляецца адзінай мэтай у адукацыі, а навучанне студэнтаў пэўным прыёмам і спосабам працы, фарміраванне ў іх інтэлектуальных дзеянняў і навыкаў мадэлявання сваіх паводзін, якія не толькі палягчаюць працэс засваення вучэбнай інфармацыі, але і навучаюць навучэнцаў у выкарыстанні рацыянальных, эфектыўных, абагульняючых прыёмаў дзейнасці, трэніруюць іх псіхічныя функцыі (памяць, мысленне, уяўленне).

Значныя змены ў сферы адукацыі ў сувязі з укараненнем кампетэнтнаснага падыходу ставяць на парадак дня фарміраванне прафесійнай кампетэнтнасці будучага настаўніка ў сістэме вышэйшай педагагічнай адукацыі.

Паняцце «прафесійная кампетэнтнасць будучага настаўніка» неабходна разглядаць з пазіцый сістэмнага падыходу і вызначаем яго як інтэгратыўную якасць асобы, якая ўключае сукупнасць кампетэнцый ў псіхолага-педагагічнай і прадметна-тэхналагічнай абласцях ведаў, якія забяспечваюць гатоўнасць да ажыццяўлення прафесійнай дзейнасці [1].

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя грамадскай думкі Беларусі» павінна дапамагчы студэнтам асэнсаваць адметнасці грамадскага развіцця Беларусі, засвоіць духоўныя каштоўнасці беларускага грамадства, паказаць ролю асобы ў гісторыі, паглыбіць агульнагістарычныя веды.

Для дасягнення пастаўленай мэты прадугледжваецца вырашэнне наступных задач: выявіць месца гісторыі грамадскай думкі Беларусі ў сістэме агульнаадукацыйных дысцыплін; прааналізаваць працэс станаўлення і развіцця грамадскай думкі Беларусі ў цеснай сувязі з гісторыяй нацыянальнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

культуры і фарміраваннем этнічнага аблічча беларускага народа на агульнаеўрапейскім фоне; азнаёміць з жыццём, дзейнасцю і духоўнай спадчынай выдатных дзеячаў гісторыі, навукі, культуры, палітыкі Беларусі.

Вывучэнне дысцыпліны «Гісторыя грамадскай думкі Беларусі» прадугледжвае фарміраванне ў студэнтаў акадэмічных, сацыяльна-асобасных і прафесійных кампетэнцый.

Сярод асноўных акадэмічных кампетэнцый можна вылучыць наступныя: валоданне грамадска-палітычнай тэрміналогіяй і паняційным апаратам; разуменне, тлумачэнне і аналіз атрыманай навуковай інфармацыі ў працэсе вывучэння дысцыпліны; валоданне ўменнем прадстаўляць вынікі даследавання ў форме дакладаў, рэфератаў; веданне асноўных катэгорый, тэарэтычных аспектаў і метадаў гісторыі грамадскай думкі Беларусі як самастойнай навуковай дысцыпліны; прадстаўленне характарыстыкі этапаў станаўлення і развіцця грамадскай думкі Беларусі; усведамленне ўкладу выдатных дзеячаў мінулага ў гісторыю грамадскай думкі Беларусі.

Не менш важнымі кампетэнцыямі з'яўляюцца сацыяльна-асобасныя. Да іх варта аднесці наступныя: удзел у захаванні і распаўсюджванні сацыяльна-карыснага вопыту назапашанага мінулымі пакаленнямі; фарміраванне міжасобасных і міжкультурных камунікацый; валоданне навыкамі і прыёмамі прафесійных адносін; імкненне да самаразвіцця, павышэння сваёй кваліфікацыі і майстэрства; гатоўнасць да калектыўнай працы; крытычнае стаўленне да сваіх моцных бакоў і недахопаў, вызначэнне шляхоў і выбар сродкаў развіцця станоўчых якасцяў і пераадоленне недахопаў.

Фарміраванне групы прафесійных кампетэнцый уключае: выкарыстанне асноўных палажэнняў і метадаў гуманітарных навук пры вырашэнні сацыяльных і прафесійных задач; уменне рабіць высновы і фармуляваць рашэнне праблемы на аснове аналізу як наяўнай інфармацыі, так і дадаткова сабранай інфармацыі; валоданне культурай мыслення, здольнасцю ўспрымаць, абагульняць, аналізаваць інфармацыю, ставіць мэту і выбіраць шляхі яе дасягнення.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен ведаць: асноўныя паняцці і тэрміны вывучаемай дысцыпліны; перыядызацыю развіцця грамадскай думкі Беларусі; выдатных палітычных, рэлігійных, навуковых, культурных дзеячаў беларускай гісторыі; асноўныя ідэі, тэорыі, канцэпцыі, якія ўзбагацілі духоўную спадчыну беларускага народа.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У працэсе вывучэння дысцыпліны ў студэнтаў фарміруюцца ўменні: характарызаваць асноўныя этапы развіцця грамадскай думкі Беларусі; разумець і тлумачыць асноўныя ідэі, тэорыі, канцэпцыі, выпрацаваныя беларускімі асветнікамі, філосафамі, навукоўцамі, грамадскімі, палітычнымі і рэлігійнымі дзеячамі; ацэньваць асноўныя дасягненні грамадска-палітычнай, прававой, філасофскай думкі Беларусі; выяўляць сувязь Беларусі з грамадска-палітычнымі і культурнымі працэсамі ў свеце; выкарыстоўваць гістарычны вопыт для аналізу сучасных тэндэнцый грамадскага развіцця Беларусі.

Студэнты павінны авалодаць таксама асноўнымі паняццямі ў галіне грамадскай думкі ва ўзаемасувязі з гісторыяй Беларусі, навыкамі работы з навуковай, навукова-папулярнай і мастацкай літаратурай падчас падрыхтоўкі да лекцыйных і практычных заняткаў, метадамі інтэрпрэтацыі з'яў і фактаў гісторыі Беларусі.

Такім чынам, вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя грамадскай думкі Беларусі» накіравана на фарміраванне ў студэнтаў асноўных акадэмічных, сацыяльна-асобасных і прафесійных кампетэнцый, цэласнага ўяўлення аб сутнасці і эвалюцыі грамадскага развіцця Беларусі.

***Літаратура***


1. Антонова, А. В. Формирование профессиональной компетентности будущего учителя истории: теоретические и практические аспекты / А. В. Антонова // Формирование компетенций в практике преподавания общих и специальных дисциплин в учреждениях среднего профессионального образования : сб. ст. по материалам Всерос. науч.-практ. конф., 5 мая 2011 г. / науч. ред. Э. Ф. Зеер. – Екатеринбург–Березовский: Филиал Рос. гос. проф.-пед. ун-та в г. Березовском, 2011. – С. 16–20.
2. Мацюш, П. А. Развіццё вышэйшай гістарычнай адукацыі ў БССР (1961–1985 гг.) : аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук : 07.00.02 / П. А. Мацюш ; БДПУ. – Мінск, 2013. – 28 с.


## РАЗВІЦЦЁ ГІСТОРЫКА-КРАЯЗНАЎЧАЙ РАБОТЫ Ў СІСТЭМЕ ВЫШЭЙШАЙ І СЯРЭДНЯЙ ШКОЛЫ БССР У 50–80-х гг. ХХ ст.


***П. А. Мацюш, БДПУ (г. Мінск)***


Вывучэнне мінулага сваёй малой Радзімы, асэнсаванне месца і ролі рэгіянальнай гісторыі ў глабальным гістарычным працэсе непарыўна звязана са станаўленнем і развіццём гістарычнага краязнаўства як асобнай галіны ведаў. Варта адзначыць беларускіх гісторыкаў, якія ўнеслі практычны ўклад


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

у развіццё гісторыка-краязнаўчай работы, садзейнічалі вылучэнню гістарычнага краязнаўства ў якасці самастойнага аб'екта навуковых даследаванняў.

Так, Я. Н. Мараш падкрэсліваў важнасць дзейнасці навуковых студэнцкіх гурткоў у вучэбнай рабоце і выхаванні маладых вучоных. На аснове вопыту навукова-даследчай работы ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце вучоны даказваў, што гісторыка-краязнаўчы гурток ВНУ з'яўляецца базай для ўзнікнення багатых даследчыцкіх калектыўных інтарэсаў па вывучэнні мясцовай гісторыі.

У дысертацыі М. В. Півавара «Гістарычнае краязнаўства Беларусі ў 1961–1991 гг.» аўтар адзначае значную работу на гістарычных факультэтах ВНУ рэспублікі па вывучэнні гісторыі і культуры роднага краю. Станаўленню краязнаўчай работы садзейнічалі кваліфікаваны выкладчыцкі склад і студэнты, якія займаліся гістарычнымі даследаваннямі ў межах пэўнага рэгіёна. Даследчык прыходзіць да высновы, што краязнаўчыя даследаванні найбольш інтэнсіўна развіваліся ў Гродне, Гомелі, Магілёве, Мінску – тых абласных цэнтрах, што ажыццяўлялі прафесійную падрыхтоўку гісторыкаў у разглядаемы перыяд.

Аналізу станаўлення і развіцця крыніцазнаўства і спецыяльных гістарычных дысцыплін на гістарычным факультэце БДУ прысвечаны артыкул М. Ф. Шумейкі. Даследчык аргументавана паказвае, што 1960-я гг. – гэта перыяд аднаўлення работы па вывучэнні крыніц айчыннай гісторыі.

Пытанні навуковай арганізацыі, планавання і ўдасканалення навуковадаследчай дзейнасці навукова-педагагічных кадраў гісторыкаў, у тым ліку развіцця гісторыка-краязнаўчай работы на гістарычных факультэтах беларускіх ВНУ, асвятляліся ў артыкулах многіх беларускіх гісторыкаў: М. Касцюка, А. Ігнаценкі, П. Савачкіна, І. Царук, Л. Шнеерсона, Г. Ліўшыца, Б. Фіха, А. Васілеўскага, М. Гнеўкі, М. Каўшарава, І. Крэня, В. Фаміна, У. Тугая, П. Дзмітрачкова і інш.

Сярод розных формаў навуковай творчасці студэнтаў важнае месца займаў іх удзел у калектыўнай навуковай рабоце. Падчас работы ў гуртках студэнты фарміравалі навыкі навукова-даследчай і публічна-прапагандысцкай дзейнасці.

У гэтым плане на гістарычным факультэце Гродзенскага педагагічнага інстытута былі створаны ўсе неабходныя ўмовы. Студэнты гістарычнага факультэта мелі магчымасць збіраць матэрыялы для вывучэння гісторыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

роднага краю. У архівах і музеях праходзілі практыкумы. Усё гэта павінна было служыць асновай для належнай арганізацыі краязнаўчай работы ў школах, стварэння школьных музеяў і гістарычных гурткоў Адна з праблем заключалася ў тым, што ў вучэбных планах адсутнічаў час для арганізацыі ўсёй гэтай шматграннай работы, што не дазваляла ахапіць усіх студэнтаў. Акрамя таго, у працэсе падрыхтоўкі спецыяліста-гісторыка не прадугледжваліся сродкі на арганізацыю навучальных экскурсій па гістарычных месцах краіны. Настаўнік гісторыі вымушаны быў распавядаць вучням аб гістарычных месцах, якія не наведваў асабіста.

На гістарычным факультэце Мінскага педагагічнага інстытута эфектыўна працаваў навуковы гурток па гісторыі Беларусі. Студэнты вывучалі праблемы беларускай гісторыі і культуры. Значная ўвага надавалася гісторыка-краязнаўчай рабоце. Удзельнікі гуртка набывалі вопыт навуковых і метадычных даследаванняў. Гурток садзейнічаў інтэрнацыянальнаму і патрыятычнаму, эстэтычнаму выхаванню будучых настаўнікаў гісторыі. Праводзіліся выязныя пасяджэнні гуртка ў музеях, школах, памятных гістарычных месцах. У навуковым гуртку студэнты фарміравалі навыкі навуковай дыскусіі, творчай дапамогі адзін аднаму пры аналізе сваёй працы.

Многія студэнты ў летні перыяд удзельнічалі ў археалагічных экспедыцыях АН БССР і спецыяльных навукова-рэстаўрацыйных вытворчых майстэрнях Міністэрства культуры БССР. У сувязі з гэтым значнае месца ў тэматыцы гуртка займалі паведамленні пра археалагічныя даследаванні ў рэспубліцы і выкарыстанне археалогіі пры вывучэнні гісторыі Беларусі ў школе. Такім чынам, навуковая работа станавілася не толькі шляхам падрыхтоўкі да паступлення ў аспірантуру, але і адным з этапаў падрыхтоўкі настаўніка.

На базе гістарычнага факультэта Магілёўскага педагагічнага інстытута дзейнічаў навуковы гурток па археалогіі, які быў створаны вучоным-археолагам, дэканам факультэта Г. І. Іоне. Ён быў запрошаны кіраўніцтвам ВНУ з аднаго з Навукова-даследчых інстытутаў Акадэміі навук СССР у адпаведнасці з прынятай у той час практыкай удасканалення кадравага патэнцыялу педагагічных інстытутаў. У Магілёве вучоны не толькі працягнуў археалагічныя даследаванні, але і арганізаваў студэнцкі навуковы гурток, актыўна выкарыстоўваў вынікі сваёй працы ў вучэбным працэсе. Менавіта з прыходам у 1964 г. на кафедру гісторыі Г. І. Іоне замацаваўся курс археалогіі, які да гэтага выкладалі запрошаныя спецыялісты [1, с. 55]. За гады дзейнасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гуртка ўдалося выявіць на тэрыторыі рэспублікі вялікую колькасць археалагічных помнікаў. Студэнты старэйшых курсаў разам з апрацоўкай матэрыялаў займаліся вывучэннем літаратуры і пісьмовых крыніц, стварэннем музейных калекцый. У 1977/78 навучальным годзе з дапамогай студэнтаў і выкладчыкаў (В. Ф. Капыціна, Я. Р. Рыера) быў створаны гісторыка-краязнаўчы музей, дзе сабраны матэрыялы па археалогіі, нумізматыцы, краязнаўстве.

У працэсе вывучэння археалагічных аб'ектаў адбывалася станаўленне навуковага светапогляду студэнтаў. Удзел у навуковых экспедыцыях даваў магчымасць разглядаць падзеі розных археалагічных эпох у дынаміцы, што пашырала і замацоўвала атрыманыя падчас аўдыторных заняткаў веды, рабіла іх канкрэтнымі і вобразнымі.

Такім чынам, наладжаная археалагічная практыка для студэнтаў узбагачала падрыхтоўку будучых настаўнікаў. Набытыя падчас практык навыкі выкарыстоўваліся імі пры напісанні курсавых і дыпломных работ, удзеле ў рэспубліканскіх аглядах і ўсесаюзных конкурсах навуковых работ. Штогод члены гуртка выступалі на навуковых студэнцкіх канферэнцыях інстытута. Акрамя таго, настаўніку гісторыі было неабходна ведаць вынікі археалагічных даследаванняў мінулага, паколькі вывучэнне першабытнаабшчыннага ладу і ранняга феадалізму на тэрыторыі Беларусі прадугледжвалася праграмай па гісторыі СССР у 7-м класе і ў значнай ступені грунтавалася на дасягненнях археалагічнай навукі [2].

На гістарычных кафедрах Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта навукова-даследчая работа таксама мела пераважна краязнаўчы характар. У вучэбным працэсе кафедры, акрамя ўключэння краязнаўчага матэрыялу ў лекцыйныя курсы, выкладалі такія спецкурсы і спецсемінары, як «Археалогія БССР», «Матэрыяльная культура беларусаў». З 1978 г. пачаў працаваць разлічаны на два гады навучання народны ўніверсітэт ведаў аб помніках гісторыі і культуры. Слухачамі ўніверсітэта з'яўляліся студэнты-гісторыкі гісторыка-філалагічнага факультэта.

Ва ўмовах рэформы сярэдняй агульнаадукацыйнай школы адбывалася ўмацаванне яе сувязі з вышэйшай школай. Сярод найбольш распаўсюджаных кірункаў супрацоўніцтва вылучаліся такія, як падрыхтоўка падручнікаў і вучэбна-метадычных дапаможнікаў, чытанне лекцый у інстытутах павышэння кваліфікацыі і ў метадычных аб'яднаннях школ і раёнаў, удзел

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

выкладчыкаў у рабоце метадычных камісій Міністэрства асветы СССР і Міністэрства асветы БССР. Выкладчыкі педагагічных інстытутаў выступалі на навукова-практычных канферэнцыях і семінарах па пытаннях навучання і выхавання школьнікаў. Асаблівае месца займала работа творчых калектываў школьнікаў пад кіраўніцтвам выкладчыкаў гістарычных факультэтаў.

З 1966 г. пры кафедры гісторыі СССР і БССР Гродзенскага педінстытута для вучняў 9–10-х класаў рэгулярна дзейнічала школа юных гісторыкаў. У дзейнасці школы спалучаліся лекцыі па агульнагістарычных праблемах з паглыбленым вывучэннем гісторыі роднага краю. Пры гэтым школьнікі не толькі праслухоўвалі лекцыі, праглядалі тэматычныя кінафільмы, але і займаліся ў гісторыка-археалагічным музеі, архіве, рыхтавалі рэфераты з выкарыстаннем архіўных дакументаў і апублікаваных крыніц. З 1973 г. на гісторыка-педагагічным факультэце з'явіўся новы від сувязі ВНУ са школай – факультэт будучых настаўнікаў. Ён уяўляў сабой адну з форм прафарыентацыйнай работы з выкладаннем серыі вучэбных цыклаў, у тым ліку і гістарычнага.

Пастановай бюро ЦК ЛКСМБ, Прэзідыума Акадэміі навук БССР, калегіі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР ад 9 чэрвеня 1970 г. «Аб мерах па паляпшэнні ідэйна-выхаваўчай работы з маладымі навукова-педагагічнымі супрацоўнікамі і аспірантамі» прадугледжвалася прыцягненне навуковых супрацоўнікаў да актыўнай работы сярод школьнай моладзі. З гэтай мэтай пры інстытутах АН БССР і ва ўсіх ВНУ рэспублікі ствараліся вочна-завочныя школы юных гісторыкаў. Так, у Беларускім дзяржаўным універсітэце, Гомельскім дзяржаўным універсітэце, Гродзенскім, Магілёўскім і Мінскім педагагічных інстытутах ствараліся школы «Юны гісторык». Развівалася дыферэнцыраванае навучанне школьнікаў. Школы і класы з паглыбленым вывучэннем прадметаў, у тым ліку і гісторыі, пачалі стварацца яшчэ з 1967/68 навучальнага года. Уводзіліся факультатыўныя заняткі, штогод праводзіліся школьныя алімпіяды па гісторыі.

У рамках школы «Юны гісторык» на гістарычным факультэце Мінскага педагагічнага інстытута праводзіліся алімпіяды па гісторыі СССР для школ Мінска і Мінскай вобласці. За ўсімі кафедрамі факультэта былі замацаваны падшэфныя школы.

Такім чынам, развіццё гісторыка-краязнаўчай работы ў 50–80-х гг. XX ст. у сістэме вышэйшай і сярэдняй школы БССР садзейнічала сістэмнаму

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вывучэнню гістарычнай спадчыны беларускага народа. На гістарычных факультэтах праводзілася значная работа па арганізацыі гісторыка-краязнаўчай работы студэнтаў. Гэта датычылася дзейнасці навуковых гурткоў, назапашвання дадатковага краязнаўчага матэрыялу, усталявання зваротнай сувязі паміж вышэйшай і сярэдняй школай у галіне «папулярызацыі» гістарычных ведаў, прыцягнення школьнікаў да даследчай работы пад кіраўніцтвам выкладчыкаў гісторыі ВНУ.

***Літаратура***


1. Гістарычны факультэт: да 75-годдзя з дня ўтварэння / Магілёўс. дзярж. ун-т ; рэдкал.: У. В. Барысенка (адк. рэд.) [і інш.]. – Магілёў : МДУ, 2010. – 241 с.
2. Гнеўка, М. Дыяпазоны будучых гісторыкаў / М. Гнеўка // Настаўн. газ. – 1984. – 30 мая. – С. 3.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ